Источник: “Голас Радзімы” – 2015-02-26

# Вялікі скарб

У бібліятэках, музеях, школах і вышэйшых навучальных установах Беларусі прайшлі святочныя імпрэзы ў гонар Міжнароднага дня роднай мовы. Адна з іх — у Цэнтральнай навуковай акадэмічнай бібліятэцы.

Ведаць мову продкаў — святы абавязак кожнага чалавека перад памяццю сваіх папярэднікаў. Прыемна, што і ў замежжы нашы супляменнікі з павагай ставяцца да моваў карэнных народаў. Так, летась спадарыня Ганна Мазур ад імя беларусаў Малдовы ў вітальным слове да ўдзельнікаў Першага форуму нацыянальных меншасцяў Рэспублікі Малдова казала: “Беларусы Малдовы перакананыя, што веданне намі, нацыянальнымі меншасцямі, дзяржаўнай мовы з’яўляецца для мажарытарнага этнасу Рэспублікі Малдовы не чым іншым, як зразумелым знакам праявы павагі да душы малдаўскага народа, прызнаннем яе вартасці”.

Шэраг цікавых, самых розных імпрэзаў прайшло да Дня роднай мовы і ў Беларусі. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук сумесна з Музеем літаратуры запрасілі школьнікаў на свята “У аснове ўсюды — слова”. “Самы найвялікшы і бяспрэчны закон жыцця — гэта людская мова, праз якую чалавек стаў вышэй за ўсіх істот пад сонцам”, — цытаваліся на імпрэзе словы Янкі Купалы. А вось меркаванне Івана Мележа: “Наша мова — гэта народны скарб. Яго нельга не шанаваць, як нельга не шанаваць родны народ”. А народная мудрасць кажа: хто забыў сваіх продкаў — сябе згубіў, а хто забыў сваю мову — усё згубіў. Асабліва ж пільна аберагаюць, шануюць гэты народны скарб беларускія пісьменнікі: дзякуючы яму яны ж і самарэалізуюцца як асобы. На сустрэчы са школьнікамі пра тое казалі пісьменнік Анатоль Зэкаў і вядомы артыст Аляксандр Ждановіч: яго малыя тэлегледачы Беларусі ведаюць як Маляваныча з вячэрняй “Калыханкі”.

Да мерапрыемства ў бібліятэцы была падрыхтавана цікавая тэматычная выстава.

Рыгор Арэшка